Источник: "Настаўніцкая газета" - 2013-03-30

Грамадства

# Навучыцца быць беларусамі

**_Трэба навучыцца пазіцыяніраваць сябе суверэннай, незалежнай дзяржавай. Такое меркаванне выказаў на навукова-практычным семінары "Гісторыя беларускай дзяржаўнасці" ў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь старшыня РГА "Белая Русь" Аляксандр Радзькоў._**

Паводле слоў Аляксандра Радзькова, суверэннай Беларусі ўжо 20 гадоў, і цяпер краіна выходзіць на новы ўзровень свайго станаўлення і развіцця. Цяпер важна пазбегнуць памылак, дапушчаных мінулымі пакаленнямі, узяць з гісторыі ўсё самае лепшае, а яшчэ трэба навучыцца сябе ўспрымаць і пазіцыяніраваць у свеце як дзяржава суверэнная, з багатымі традыцыямі і сваёй пазіцыяй на міжнароднай арэне. "Актыў нашай арганізацыі як ніхто іншы знаходзіцца найбліжэй да грамадзян, і менавіта актывісты "Белай Русі" павінны разумець і ўсведамляць перспектывы развіцця дзяржаўнай самастойнасці Рэспублікі Беларусь, ментальнасць беларусаў, вучыць моладзь шанаваць гісторыю, карані, святыні і нашы нацыянальныя асаблівасці", — сказаў ён.

"Каб паспяхова ажыццяўляць работу сярод шырокіх слаёў беларускага грамадства, неабходна валодаць гістарычнымі ведамі. Выкарыстоўваючы магчымасці інфармацыі, варта больш актыўна, я нават сказаў бы настойліва, прапагандаваць дасягненні беларускага народа ў галіне мовы, культуры, духоўных традыцый і каштоўнасцей", — падкрэсліў акадэмік-сакратар аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, доктар гістарычных навук, прафесар Аляксандр Каваленя. Гэта будзе не толькі садзейнічаць трансляцыі гістарычнага вопыту і мэтанакіравана ўмацоўваць гістарычную свядомасць беларускіх людзей, але і дэманстраваць свету багацце гісторыка-культурнай спадчыны беларусаў. "Нездарма мудрацы кажуць, што адносіны да гісторыі — перакanаўчы паказчык цывілізаванасці грамадства, яго духоўна-маральнага багацця", — лічыць ён.

Арганізатарамі мерапрыемства выступілі РГА "Белая Русь", аддзяленне гуманітарных навук і мастацтваў НАН Беларусі, Інстытут гісторыі НАН Беларусі.

"Настаўніцкая газета". Навучыцца быць беларусамі